Источник: "Настаўніцкая газета" - 2018-09-04

# Ён быў арыгінальным вучоным шматграннага таленту

**Сяргей Яўгенавіч Рассадзін быў адным з самых таленавітых беларускіх вучоных-гісторыкаў і археолагаў. Яго малая радзіма — Гомель. Тут, у сям'і служачых, 30 ліпеня 1958 года пачаўся яго жыццёвы шлях. У 1981 годзе Сяргей Рассадзін скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, а ў 1981—1984 гадах быў аспірантам Інстытута гісторыі АН БССР. На вялікі жаль, жыццёвы шлях гэтага арыгінальнага вучонага аказаўся кароткім.**

Я ведаў гэтага чалавека больш за чвэрць стагоддзя. Сустракаліся часцей за ўсё ў памяшканні Інстытута гісторыі АН БССР, дзе ён прайшоў шлях ад малодшага навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі першабытнага грамадства, навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі жалезнага веку да старшага навуковага супрацоўніка аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін. Часта выступаў на пасяджэннях навуковых саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па гістарычных навуках, на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях.

Сяргей Яўгенавіч быў апантаным даследчыкам. Ён скрупулёзна вывучаў археалогію, старажытную гісторыю, гісторыю Сярэднявечча, новую гісторыю, геральдыку, асобныя праблемы крыніцазнаўства. Толькі такі даследчык сярэднявечнай Беларусі мог "адкапаць" унікальны горад сярэдзіны XVII стагоддзя Казімеж каля Бабруйска і напісаць бліскучы артыкул "Гербовый привилей 1643 г. на магдебургию городу Казимежу в старостве Бобруйском".

У 1999 годзе, будучы членам савета па абароне доктарскіх дысертацый па гістарычных навуках пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, я быў сведкам бліскучай абароны доктарскай дысертацыі начальнікам аддзела Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Сяргеем Рассадзіным па тэме "Племена и народы "Заскифского" Севера и Северо-Востока". У той час яму было толькі 40 гадоў.

Праз тры гады, у 2002 годзе, Сяргей Яўгенавіч становіцца прафесарам кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта і будзе працаваць на ёй 17 гадоў. Ён стане адным з самых паважаных і аўтарытэтных прафесараў гэтай установы вышэйшай адукацыі. Многія студэнты будуць называць яго "наш эрудыт", "галава", "хадзячая энцыклапедыя".

З 1998 года Сяргей Яўгенавіч займаў адказную пасаду начальніка Дзяржаўнай геральдычнай службы краіны. У 2002—2012 гадах С.Я.Рассадзін з'яўляўся членам Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У 2007 годзе яго ўзнагародзілі медалём святціцеля Кірылы Тураўскага, у гэтым жа годзе Сяргей Яўгенавіч стаў стыпендыятам Германскага археалагічнага інстытута.

У час аднаго з перапынкаў "на каву" ў час міжнароднай канферэнцыі ў Мінску я спытаў у Сяргея Яўгенавіча, хто аказаў найбольшы ўплыў на фарміраванне яго гістарычнага светапогляду. І пачуў у адказ: "Леў Мікалаевіч Гумілёў, Эдуард Міхайлавіч Загарульскі, Аляксей Рыгоравіч Мітрафанаў, з замежных — Густаў Касіна, Хасэ Артэга-і-Гасет".

Шматграннасць таленту С.Я.Рассадзіна праявілася перш за ўсё ў тым, што ён паспяхова вывучаў мілаградскую культуру, пісьмовыя крыніцы і этнагеаграфію антычнасці, праблемы паходжання славян, геральдыку і тытулязнаўства, археалогію ранняга жалезнага веку і позняга Сярэднявечча, праблемы скіфскіх уплываў на паўночныя землі, антычныя крыніцы аб старажытным насельніцтве Усходняй Еўропы і Паўночна-Заходняй Азіі, распрацоўваў сучасную гарадскую геральдыку і эмблематыку.

Не магу забыць, як Сяргей Яўгенавіч 13 гадоў назад пачаў праводзіць археалагічныя раскопкі адкрытых ім горада Казіміра сярэдзіны XVII стагоддзя ў Светлагорскім раёне і сядзібы Шапілінскі Востраў у горадзе Светлагорску.

С.Я.Рассадзін быў аўтарам больш за 300 навуковых прац, шэраг якіх можна назваць унікальнымі і вельмі арыгінальнымі.

Калі я перачытваю "Энцыклапедыю гісторыі Беларусі", прыходжу да высновы, што артыкулы С.Я.Рассадзіна ў гэтым выданні асабліва дадаюць гонару і яму самому, і гэтай энцыклапедыі. Сяргей Яўгенавіч быў навуковым кансультантам трох яе кніг — 5-га тома (1999), першай кнігі 6-га тома (2001), другой кнігі 6-га тома (2003).

А яшчэ трэба адзначыць, што Сяргей Яўгенавіч быў абаяльным, ветлівым і цікавым суразмоўнікам, выкладчыкам строгім, але справядлівым. Ён вельмі любіў дыскутаваць са студэнцкай моладдзю па вострых праблемах гісторыі Беларусі, любіў адказваць на іх пытанні. С.Я.Рассадзін заўсёды падкрэсліваў, што трэба "разважаць і ўмець даказваць, а не рабіць катэгарычныя высновы". Калі я аднойчы запытаў, што больш за ўсё яму падабаецца ва ўніверсітэцкай рабоце, Сяргей Яўгенавіч адказаў: "Праводзіць семінарскія заняткі ў форме дыскусіі".

Апошняй прыжыццёвай навуковай работай С.Я.Рассадзіна стаў артыкул "Орнамент на Государственном флаге Республики Беларусь: древнейшие истоки", апублікаваны ў першым нумары часопіса "ТРУДЫ БГТУ. Серия 6. История и философия" за 2017 год.

Лічу мэтазгодным пазнаёміць чытачоў "Настаўніцкай газеты" з анатацыяй да гэтага артыкула: "В статье обоснована историческая приоритетность национального орнамента, помещенного на Государственном флаге Республики Беларусь. Среди всех известных символов белорусской государственности он наидревнейший, поскольку впервые ромбический орнамент зафиксирован на Мезинском палеолитическом поселении, возрастом двадцать тысяч лет назад, а также на Доброборском, шесть тысяч лет назад, на Почепском, две тысячи лет назад, и т.д. Таким образом, символы, вытканные (или вышитые?) на рушнике в 1917 г. Матрёной Маркевич, восходят к древней и древнейшим эпохам. Эти символы означают производительную мощь природы, в частности плодоносящую силу земли".

Сэрца вядомага вучонага-археолага, гісторыка, крыніцазнаўца, геральдыста, буйнейшага спецыяліста па гісторыі Вялікай Скіфіі, Педагога з вялікай літары, доктара гістарычных навук, прафесара Сяргея Яўгенавіча Рассадзіна перастала біцца 2 ліпеня 2017 года. Цяжка было паверыць у гэты трагічны факт, таму што ён быў вялікі жыццялюб і аптыміст.

Уклад С.Я.Рассадзіна ў развіццё навукі і сістэмы вышэйшай адукацыі Беларусі варты таго, каб імя чалавека, які яго зрабіў, назаўсёды засталося ў нашай памяці.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**прафесар БДПУ імя Максіма Танка,**
**доктар гістарычных навук.**

Эмануіл Іофе. Ён быў арыгінальным вучоным шматграннага таленту